# Беларускі Ясенін

**На Уздзеншчыне ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы 16 мая 2024 года прайшло літаратурна-музычнае свята «На сцежках светлай вясны…», прымеркаванае да 120-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка, перакладчыка Паўлюка Труса.**

Вершаваныя сцэны з жыцця Паўлюка Труса прадставілі ўдзельнікі тэатральнай студыі «Вітамін» СШ № 2 імя К. К. Крапівы. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп цытаваў вершы юбіляра, а таксама прачытаў сваю баладу, прысвечаную Паўлюку Трусу, якая нагадала пра тое, што ён памёр зусім маладым. Старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Леанід Крыванос адзначыў яркі талент і арыгінальнасць мастака слова, якога называлі «беларускім Ясеніным».

Не толькі да творчасці Паўлюка Труса звярталіся госці імпрэзы. Ганаровы архівіст Рэспублікі Беларусь, укладальніца кнігі выбраных твораў Паўлюка Труса Ганна Запартыка з цеплынёй згадвала мерапрыемства, якое ладзілася да 100-годдзя паэта на яго малой радзіме ў в. Нізок. Цяпер пры ўездзе ў вёску намаганнямі супрацоўнікаў раённай бібліятэкі і па ініцыятыве пляменніцы Паўлюка Труса Марыі Міхайлаўны Крупнік установлены інфармацыйны стэнд, каб ушанаваць памяць паэта і іншых знакамітых ураджэнцаў гэтых мясцін.



*Удзельнікі літаратурна-музычнага свята.*

Галоўны бібліёграф інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Юлія Амосава звярнулася да фонду Уздзенскай цэнтральнай бібліятэкі, дзе захоўваюцца кнігі П. Труса, якія выйшлі ў 1920—1930-я гг. Яна раскрыла гісторыю перадачы гэтых дакументаў у фонд кніжніцы з асабістай бібліятэкі супрацоўніцы-ветэрана Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Святланы Базылёвай-Ланько.

Загадчык аддзела бібліятэказнаўства Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Таццяна Лаўрык паведаміла пра абласны конкурс віртуальных рэсурсаў, прысвечаных пісьменнікам-землякам, які праходзіў у публічных бібліятэках Мінскай вобласці ў 2023 годзе ў рамках літаратурна-краязнаўчага абласнога праекта «Пісьменнікі — ураджэнцы роднага краю». Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса ў гэтай ініцыятыве атрымала дыплом II ступені за віртуальны музей Паўлюка Труса, створаны на афіцыйным сайце бібліятэкі.

**Таццяна ЛАЎРЫК**
**Фота Аксаны ДАНІЛЬЧЫК**